**Сутула, Г.** Аляксандр Казак – лаўрэат звання «Чалавек года Віцебшчыны–2021» / Г. Сутула // Веснік Глыбоччыны. – 2022. – 19 сак. – С. 4.

**АЛЯКСАНДР КАЗАК – ЛАЎРЭАТ ЗВАННЯ «ЧАЛАВЕК ГОДА ВІЦЕБШЧЫНЫ–2021»**

**У Сафійскім саборы 15 сакавіка ўшаноўвалі лаўрэатаў звання «Чалавек года Віцебшчыны–2021». Імі сталі пяцьдзесят прадстаўнікоў розных сфер дзейнасці з усіх рэгінаў вобласці. Сімвалічна, што ў Год гістарычнай памяці ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання ўпершыню прайшла ў старажытным Полацкцу – духоўнай і культурнай сталіцы краіны, дзе зарадзілася беларуская дзяржаўнасць.**

**Заслужаных людзей Віцебшчыны, якія сваёй самаахвярнай працай, ініцыятывай, наватарствам унеслі значны ўклад у развіццё эканамічнага патэнцыялу не толькі свайго рэгіёну, але і ўсёй краіны, вітаў старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Субоцін:**

**– Вы робіце нашмат больш, чым напісана ў вашых прадстаўленнях. Вашы дасягненні – гэта не аднахвілінны трыумф. Аўтарытэту, прафесіяналізму і заслужаных ганаровых узнагарод вы дабіваліся на працягу многіх працоўных дзесяцігоддзяў. Добрасумленная праца, дзелавы аптымізм, інавацыйныя падыходы адкрываюць для вас новыя гарызонты ў розных сферах і галінах, а дасягнутыя вынікі ўмацоўваюць імідж вобласці. Даказвайце і паказвайце на ўласным прыкладзе, на што здольны чалавек, грамадзянін сваёй краіны, якім кіруе жаданне зрабіць свой край прыгожым і заможным. Жадаю ўсім здароўя, развіцця творчага патэнцыялу, дабрабыту і шчасця на бацькоўскай зямлі.**

**У намінацыі «Аграпрамысловы комплекс, ахова навакольнага асяроддзя, лясная гаспадарка» Аляксандр Субоцін уручыў узнагароду начальніку Глыбоцкай раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандру Казаку.**

**Прадстаўнікі Глыбоччыны, старшыня раённага аб'яднання прафсаюзаў Таццяна Лазаронак і галоўны спецыяліст арганізацыйна-кадравага аддзела райвыканкама Алена Баран, шчыра павіншавалі земляка з высокай узнагародай і пажадалі, каб яна была не апошняй.**

**Завяршылася мерапрыемства святочным канцэртам. У сценах Сафійскага сабора прагучалі творы сусветна вядомых кампазітараў у выкананні камернага аркестра «Еўропа-Цэнтр» пры ўдзеле арганісткі, заслужанай артысткі Беларусі Ксеніі Пагарэлай, музыкантаў Наваполацкага дзяржаўнага музычнага каледжа пад кіраўніцтвам дырыжора Раіля Садыкава.**



Аляксандр Казак сёмы год узначальвае раённую інспекцыю прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Ён адказны, прынцыповы, граматны кіраўнік, выдатны стратэг і тактык. Паставіўшы перад сабой задачу, абавязкова вырашае яе і ніколі не адкладвае на заўтра тое, што можа і павінен зрабіць сёння. Яго добрасумленная праца – выніковая, выкананне рабочых абавязкаў – прафесійнае, таму як кіраўнік атрымлівае заслужаныя ўзнагароды, а міні-калектыў Глыбоцкай інспекцыі прыродных рэсурсаў надзейна замацаваўся на пазіцыях лепшых у вобласці.

Аляксандр Казак – ураджэнец Мінскай вобласці. Скончыў Старыцкую дзесяцігодку Копыльскага раёна. Вясковы хлопец са школьных гадоў быў актыўным і спартыўным, умелым арганізатарам. Вучыўся добра, марыў стаць урачом. Хацеў падаваць дакументы на лячэбны факультэт, але прарэктар Мінскага медыцынскага інстытута пераканаў яго зрабіць выбар на карысць санітарна-гігіенічнага. Хлопец згадзіўся, хоць і не ўяўляў, што гэта за прафесія і што яму прыйдзецца рабіць.

– На першых чатырох курсах мы вывучалі лячэбную справу, праходзілі практыку ў мінскіх бальніцах, атрымлівалі ўрачэбны досвед і толькі на пятым – спецыялізаваныя веды па абраным профілі, – расказвае Аляксандр Аляксандравіч.

Хлопец ён быў старанны, настойлівы, працаздольны, таму і вучыўся добра, і ў студэнцкіх атрадах шчыраваў. Тры гады ездзіў з равеснікамі ў Карэлію, зарабляў грошы на будоўлях, хацеў купіць аўтамабіль без падтрымкі бацькоў. Акрамя студэнцкіх атрадаў было ў яго жыцці і студэнцкае вяселле. З будучай жонкай, глыбачанкай Святланай, Аляксандр пазнаёміўся падчас праходжання практыкі. Святлана таксама вучылася ў тым жа медінстытуце на стаматалагічным факультэце. Сябравалі і прыглядаліся адзін да аднаго нядоўга: праз год падалі заяву ў ЗАГС... Атрымаўшы дыплом, Аляксандр не паехаў па размеркаванні, бо быў сямейным чалавекам: паехаў да жонкі, якая жыла з дачушкай у Глыбокім.

Яго першым рабочым месцам быў раённы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі, а першым рабочым днём стаў выезд у камандзіроўку ў Чарнобыльскую зону, пацярпелую ў выніку аварыі на АЭС.

– Мяне накіравалі ў Краснапольскі раён Магілёўскай вобласці. Разам з калегамі з Наваполацка, Сянно, Верхнядзвінска мы праводзілі адборы проб прадуктаў харчавання з прыватных падвор’яў жыхароў, якія адмовіліся ад эвакуацыі і засталіся жыць на радзіме, а таксама складалі радыяцыйную карту раёна. Запомнілася спёка, пыльныя дарогі, па якіх калясілі, сухасць у роце, ад якой язык не варочаўся, і ўзровень радыяцыі, якая месцамі перавышала дапушчальную норму ў сто разоў. Радыяцыйным было малако, зерне, гародніна з градак, вада, – успамінае Аляксандр Аляксандравіч. – Вясной буяла квецень, грыбоў у лесе нарасло, хоць касой касі. А яшчэ запомнілася нашэсце змей: іх хапала не толькі ў балотах, але і ў населеных пунктах, ступіць баяліся.

Мясцовыя жыхары, ды і мы нібы і ўсведамлялі, што радыяцыя – гэта небяспечна для здароўя, але ж яна нябачная, таму і не верылі, што прынясе шкоду чалавеку. А яна рабіла непрыгоднай для земляробаў зямлю, атручвала паветра і прыроду, адбірала чалавечыя жыцці.

Медаль удзельніка ліквідацыі аварыі на Чарнобыльскай АЭС Аляксандру Казаку ўручылі ў ваенкамаце пасля вяртання ў Глыбокае. У дадатак у яго, як у ліквідатара, былі льготы па аплаце камунальных паслуг, бясплатны праезд па тэрыторыі краіны, санаторна-курортнае лячэнне без чаргі, 15 дадатковых каляндарных дзён да водпуску. Але гэта не магло вырашыць праблем са здароўем, з якімі мужчыну прыйшлося змагацца на працягу пяці гадоў.

– Урачом па камунальнай гігіене і гігіене працы ў раённым цэнтры гігіены і эпідэміялогіі я адпрацаваў дваццаць два гады. Лія Канстанцінаўна Субач, якая ўзначальвала цэнтр, была прыкладам граматнага кіраўніка, у якога было чаму вучыцца, і выдатнага чалавека, на якога хацелася быць падобным. Калектыў пры ёй быў маналітным і дружным. Мы з жаданнем ішлі а працу, разумелі, што агульны вынік залежыць ад кожнага з нас, таму і стараліся, – кажа Аляксандр Аляксандравіч. – З 2009 года я прыйшоў у раённую інспекцыю прыродных рэсурсаў. Міхаіл Кміта – чалавек прынцыповы, зацікаўлены быў тады начальнікам, вучыў мяне азам новай справы, і лішняй гэта навука не была. З 2015 года я кірую інспекцыяй, і атрыманыя ад Міхаіла Пятровіча веды лічу сапраўднай знаходкай. Удзячны маім былым калегам, вядучаму спецыялісту Ганне Лысенка, галоўнаму бухгалтару Наталлі Пахом, якія падтрымлівалі мяне, кіраўніка-пачаткоўца, спрыялі рабочаму настрою і гарманічнаму мікраклімату ў калектыве. Пасля аптымізацыі мы працуем з галоўным спецыялістам Артурам Гапанёнкам, дзелім на дваіх і зоны адказнасці, і пятнаццаць накірункаў дзейнасці інспецкцыі. Дзякуючы ўзаемаразуменню і падтрымцы адміністрацыі раёна праблемы не складзіруем і не кансервуем, надзённыя пытанні вырашаем па меры іх паступлення. Спадзяёмся, што агульнымі намаганнямі наша Глыбоччыны ёсць і будзе чыстай і прыгожай.

Вада, паветра, зямля, арэнда азёр, каналізацыя, адходы, санітарны стан навакольнага асяроддзя і прадпрыемстваў усіх форм уласнасці, дазвольная дзейнасць, кантроль за нарыхтоўкай грыбоў і ягад, жывёльным і раслінным светам, занесеным у Чырвоную кнігу... Хочацца, каб на роднай зямлі быў парадак, каб кожны па-гаспадарску адносіўся да прыродных каштоўнасцей, цаніў, аберагаў, захоўваў і памнажаў іх. Мы – часцінка прыроды і павінны жыць з ёй у згодзе, быць не варварамі, а сябрамі.

Аляксандр Казак – «не штабны генерал, а палявы камандзір», які ведае кожны куточак раёна. Чалавек такой пазіцыі і працаздольнасці па заслугах ацэнены дзяржавай. Сярод узнагарод – граматы і падзякі Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Дошка гонару Міністэрства, падзяка Міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, грамата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, званне лаўрэата «Чалавек года Віцебшчыны–2021»...

У Аляксандра Аляксандравіча, актыўнага, дзейснага, апантанага работай чалавека, лёгкага на нагу і на ініцыятыву, шмат задум і планаў. Усе яны звязаны з Глыбоччынай, якая стала для яго роднай, з аховай прыроды беларускага краю, для чаго ён не шкадуе ні сіл, ні часу.

***Галіна СУТУЛА*. Фота аўтара**